выканальніцкім мастацтве вельмі патрэбная скіравальная індывідуальнасць. У аркестры гэтай індывідуальнасцю, як правіла, з'яўляецца асоба дырыжора.

---


1. Известия крестьянских, рабочих, красноармейских и батрацких депутатов. — 1919. — 8 июля.

2. Известия Витебского губревкома и губкома РКП. — 1920.—27 июля; 17 окт.

3. Малько Н.А. Воспоминания. Статьи. Письма. — Л., 1972. — С. 22, 99, 158, 212.



**Сялюціна С.В,**
магістр


## БІЗНЕС-БІБЛІЯТЭКІ

Валоданне неабходнай сучаснай дакладнай інфармацыяй становіцца дамініруючым фактарам для дасягнення поспехаў як у навуцы, прадпрымальніцтве, так і ў іншых сферах дзейнасці. Пераход да рыначных адносін стымуляваў імклівы рост попыту на дзелавую інфармацыю. Гэта абумовіла рэзкі рост патрабаванняў да яе якасці, аператыўнасці, што, у сваю чаргу, з'явілася магутным стымулам для ўзнікнення бізнес-бібліятэк, сектараў, кабінетаў дзелавой інфармацыі.

Дзейнасць гэтых сектараў накіравана на рашэнне наступных задач:

— высвятленне патэнцыяльных спажыўцоў інфармацыі;

— нязменнае вывучэнне інфармацыйных запытаў абанентаў;

— нязменнае вывучэнне інфармацыйных рэсурсаў рэгіёна;

— удасканаленне нормаў і метадаў абслугоўвання;

— фарміраванне фонду камерцыйнай, даведачнай, дзелавой інфармацыі.

Інфармацыйныя патрэбы прадпрымальнікаў, прадпрымальніцкіх асацыяцый, юрыстаў, эканамістаў,

студэнтаў з'яўляюцца асноўным стымулам бібліятэчнай працы. Бізнес-бібліятэка выступае выключна як інструмент рэалізацыі гэтых патрэб у якаснай інфармацыі.

Такім чынам, асноўнай мэтай дзейнасці дзелавых бібліятэк з'яўляецца забеспячэнне эканамічнай, тэхнічнай, камерцыйнай, рэкламнай інфармацыі карыстальнікаў бібліятэкі, прадстаўнікоў прадпрыемстваў, навуковых арганізацый, фірмаў, банкаўскіх структур.

Аналіз набытага вопыту інфармацыйнага забеспячэння сферы прадпрымальніцтва паказвае, што формы і характар гэтай дзейнасці адрозніваюцца разнастайнасцю, пераемнасцю ў выкарыстанні шмат якіх метадаў работы, а таксама навізной. Сярод паслуг, якія аказвае бізнес-бібліятэка, можна назваць:

— інфармацыйна-бібліяграфічнае абслугоўванне мясцовых органаў улады, прамысловай вытворчасці на аснове ўзаемакарысных дагавораў;

— бібліятэчна-інфармацыйная падтрымка семінараў, нарад;

— дайджэсты па розных праблемах;

— дапамога пачынаючым прадпрымальнікам і асобам, якія вывучаюць прадпрымальніцтва моладзі.

Ужо сёння вырашаюцца пытанні аб стварэнні Міжнароднай асацыяцыі дзелавых бібліятэк (МАДБ) з мэтай каардынацыі дзейнасці інфармацыйных структур, арганізацыі бізнес-цэнтраў па інфармацыйным забеспячэнні айчынных і замежных спажыўцоў (напрыклад, праект Расія—ЗША, дзе адным з галоўных кампанентаў з'яўляецца дзелавая інфармацыя).

У сучасны момант пры стварэнні аўтаматызаванай інфармацыйнай сеткі, актыўнай рэкламе магчымасцей бібліятэкі, падборы і падрыхтоўцы кадраў бізнес-бібліятэка сапраўды зможа гарантаваць сваім карыстальнікам бесперашкоднае, хуткае, дасканалае атрыманне надзейнай інфармацыі.